Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
культуры і мастацтваў»
____________________ В. М. Міхееў
«_____» ______________ 2013 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____/вуч.

# НАРОДНАЕ ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

*Вучэбная праграма па спецыяльнасці 1-15 02 01*
*Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці*
*1-15 02 01-07 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва*
*(рэстаўрацыя вырабаў)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2013

**Складальнікі:**

*Р. Ф. Шаура,* загадчык кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар мастацтвазнаўства, прафесар;

*У. Ц. Гардзеенка,* прафесар кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», дацэнт

**Рэцэнзенты:**

*В. І. Жук,* дырэктар філіяла «Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы НАН Беларусі», доктар мастацтвазнаўства, прафесар;

*В. В. Калацэй,* загадчык кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», дацэнт

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 16.02.2012 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 24. 05. 2012 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *В. Б. Кудласевіч*

Адказны за выпуск *Р. Ф. Шаура*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

У падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва асобнае значэнне набывае веданне яго гісторыі і тэорыі. Тэарэтычнае асэнсаванне спецыфікі народнага мастацтва, гісторыі развіцця і сучаснага стану дае магчымасць вызначыць яго месца ў сістэме культуры, а таксама выявіць функцыі, ролю і значэнне ў айчыннай культурнай прасторы.

У мастацтвазнаўчай літаратуры народная творчасць разглядаецца як рукатворнае мастацтва, якое ствараецца чалавекам (калектывам) у працэсе мастацка-творчай дзейнасці. Яно ўмоўна падзяляецца на дзве разнавіднасці – дэкаратыўна-прыкладную (утылітарна-функцыянальную) і выяўленчую, не звязаную або мала звязаную са стварэннем і эстэтызацыяй прадметаў функцыянальнага прызначэння. Трэба адзначыць, што народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і выяўленчае суіснуюць у адзінай сацыякультурнай прасторы, валодаюць пэўнымі тыпалагічнымі асаблівасцямі і прыкметамі, маюць канкрэтныя механізмы функцыянавання ў грамадстве, свой гістарычны і сацыяльны пасыл развіцця.

Прасачыць шляхі станаўлення народнага выяўленчага мастацтва Беларусі, ахарактарызаваць яго гістарычныя вехі развіцця і вызначыць зместавыя і мастацка-вобразныя асаблівасці і з'яўляецца *асноўнай задачай* дадзенай праграмы.

У працэсе праходжання студэнтамі вучэбнай дысцыпліны «Народнае выяўленчае мастацтва» выкарыстоўваюцца розныя тэхналогіі і метады навучання. Адной з тэхналогій, якая дазваляе навучэнцу стаць суб'ектам навучання і паспяхова развіваць самастойнасць і камунікатыўныя ўменні, з'яўляецца тэхналогія калектыўнага ўзаеманавучання, або калектыўны спосаб набыцця ўменняў і навыкаў у выўленчым мастацтве.

Калектыўным спосабам навучання з'яўляецца такая яго арганізацыя, пры якой навучанне студэнтаў ажыццяўляецца шляхам іх сумеснай працы ў вывучэнні тэорыі і гісторыі народнага выяўленчага мастацтва, дзе бачны творчы ўзровень падрыхтоўкі і веды кожнага, пры гэтым работы найбольш паспяховых студэнтаў могуць служыць пэўным узорам для менш падрыхтаваных у вывучэнні дадзенай дысцыпліны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэхналогія поўнага засваення ведаў і навыкаў прадугледжвае арганізацыю працэсу аптымізацыі вучэбнай дзейнасці навучэнцаў пры выкарыстанні сукупнасці способаў (метадаў, прыёмаў, аперацый) педагагічнага ўздзеяння, якія робяць дасягненне больш высокага выніку ўсімі навучэнцамі ў навучальным працэсе.

Тэхналогія арганізацыі рэфлексійнай дзейнасці – гэта здольнасць чалавека да самапазнання, якое з'яўляецца праяўленнем унутрыасобаснага інтэлекту. Для ўсіх тыпаў рэфлексіі найбольш агульнымі спосабамі з'яўляюцца:

– выражэнне ўпэўненасці;
– меркаванні;
– сумненні;
– пытанні.

Усе віды рэфлексіі актывізуюцца пры стварэнні ў чалавека ўстаноўкі назіраць і аналізаваць уласнае пазнанне, паводзіны і разуменне гэтых паводзін пры вырашэнні вучэбных і творчых задач.

Праграма па дысцыпліне «Народнае выяўленчае мастацтва» распрацавана ў адпаведнасці з патрабаваннямі існуючых адукацыйных стандартаў і грунтуецца на прынцыпах навуковасці, свядомасці, даступнасці і пасільнасці, сістэматычнасці і паслядоўнасці вырашэння тэхніка-выканальніцкіх задач і прадугледжвае выкарыстанне ў навучальным працэсе такіх метадаў навукова-творчага пазнання, як назіранне, параўнанне, абагульненне, метад аналізу і сінтэзу.

Матэрыял вучэбнай праграмы мае непасрэдную сувязь з іншымі дысцыплінамі не толькі мастацкага профілю, але і з педагогікай, псіхалогіяй, культуралогіяй, мастацтвазнаўствам.

*Мэтай дысцыпліны* з'яўляецца фарміраванне ў будучых спецыялістаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ведаў у галіне тэорыі і гісторыі народнага выяўленчага мастацтва як аднаго з складаючых нацыянальнай мастацкай культуры.

Праграма прадугледжвае вырашэнне наступных вучэбных *задач:*

– развіццё здольнасцей студэнтаў пазнаваць і аналізаваць гістарычныя працэсы ў мастацкай культуры Беларусі;

– набыццё неабходных тэарэтычных ведаў па народным мастацтве і іх выкарыстанне ў далейшай прафесійнай практыцы;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– засваенне новых матэрыялаў у галіне традыцыйнага народнага мастацтва, якія стануць для студэнтаў грунтоўным навуковым падмуркам у далейшым даследаванні народнай творчасці.

Выпускнік павінен *ведаць:*

– тэарэтычныя і метадалагічныя асновы народнага выяўленчага мастацтва;

– развіццё народнага выяўленчага мастацтва Беларусі на працягу XVIII–XIX стст.;

– асаблівасці народнага мастацтва 1920–1940-х гг.;

– выяўленчы прымітыў і формы яго праяў у народным мастацтве;

*умець:*

– характарызаваць эпоху, час у развіцці народнай мастацкай культуры;

– аналізаваць творы народнага мастацтва з улікам вобразна-пластычнай і зместавай трактоўкі;

– вызначаць мастацка-эстэтычныя якасці народнага жывапісу, графікі і скульптуры і выяўляць іх асаблівасці ў параўнанні з іншымі відамі мастацтва.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Народнае выяўленчае мастацтва» прадугледжана 48 гадзін, з іх 22 гадзіны – аўдыторныя заняткі (18 гадзін – лекцыі, 4 гадзіны – семінарскія). Рэкамендаваная форма кантролю ведаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | семі-нарскія |
| Уводзіны | 2 | 2 | |
| *Тэма 1.* Народнае выяўленчае мастацтва канца XVIII – першай паловы XIX ст. | 8 | 6 | 2 |
| *Тэма 2.* Асаблівасці развіцця традыцыйнага народнага і аматарскага выяўленчага мастацтва ў перыяд 1920–40-х гг. | 2 | 2 | |
| *Тэма 3.* Народная выяўленчая творчасць другой паловы XX – пачатку XXI ст. Структура кіруючых арганізацый і кадравае забеспячэнне сферы народной творчасці | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 4.* Выяўленчы прымітыў і формы яго праяўлення ў народным мастацтве | 4 | 4 | |
| **Разам…** | **22** | **18** | **4** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

Паняцце «народнае выяўленчае мастацтва» і яго спецыфіка. Народныя промыслы і рамёствы. Утылітарна-функцыянальная асаблівасць дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Функцыі карыснасці, эканамічнасці, мэтазгоднасці, эстэтычнасці і духоўнасці.

Народнае мастацтва і яго адлюстраванне ў навуковай літаратуры. Заснавальнікі тэорыі народнага мастацтва: А. В. Бакушынскі, А. І. Някрасаў, В. С. Воранаў, М. А. Някрасава, М. М. Пунін. Даследчыкі народнага мастацтва другой паловы XX ст.: В. Д. Балдзіна, К. Г. Багемская, М. А. Бяссонава, З. Н. Крылова, А. В. Лебедзеў, Г. С. Астроўскі, В. А. Памешчыкаў, В. Н. Пракоф'еў, Н. М. Шкароўская і інш.

Самадзейная і аматарская творчасць і формы іх праяўлення ў соцыуме. Традыцыі ў народным дэкаратыўна-прыкладным і выяўленчым мастацтве, іх асаблівасці.

*Фарміраванне выяўленчага прымітыву ў сацыяльна-гістарычным аспекце.*

Тэрміналагічныя паняцці прымітыву, яго сінонімы. Гісторыя развіцця выяўленчага прымітыву. Дзяржаўная акадэмія мастацкіх навук (ГАХН, 1921) і яе навукова-даследчыцкая дзейнасць. Ленінградскі інстытут народаў Поўначы (Ленинградский институт народов Севера, 1930) і асаблівасці яго функцыянавання.

Новы даследчыцкі этап прымітыву ў выяўленчым мастацтве (другая палова 1960-х). Маргінальнае мастацтва. «Аутсайдер-арт», «Ар-брют». Прымітыў і прымітывізм. Творчасць М. Ларыёнава, Н. Ганчаровай, М. Шагала ў кантэксце прымітыўнага мастацтва. Выстаўкі мастацтва прымітыву ў Еўропе. Меркаванні А. В. Бакушынскага і В. С. Воранава аб прымітыве ў народным мастацтве. Прыродатворчая і генетычная аснова мастацтва прымітыву.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 1. Народнае выяўленчае мастацтва канца XVIII – першай паловы XIX ст.*

*Народныя асновы ў іканапісе і манументальных формах культавага жывапісу XVIII–XIX стст.*

Абраз як адзін з відаў рэлігійнага жывапісу. Развіццё культавага жывапісу Беларусі ў XVII–XVIII стст., уплыў Усходу і Захаду, выявы мясцовага тыпажу і ўкладу жыцця. Месца і роля гравюр беларускіх, рускіх і заходнееўрапейскіх старадрукароў. Характэрная асаблівасць іканапісу другой паловы XVIII ст. Вобразная структура народных абразоў. Рэакцыя афіцыйнай царквы на народны іканапіс як прадмет рэлігійнага прызначэння. Асаблівасці народных абразоў Гомельшчыны. Абразы Усходне-Палескага рэгіёна, іх адметныя рысы.

Манументальны роспіс у народнай мастацкай культуры XVII–XIX стст. Роспіс царквы Куцейнскага Богаяўленскага манастыра ў Оршы. Жывапісны роспіс драўлянай Троіцкай царквы Маркавага манастыра ў Віцебску. Мастацкае аздабленне былога касцёла св. Міхаіла ў Цімкавічах Капыльскага раёна. Сінтэз прафесійнага майстэрства і ўмельства народных майстроў.

*Лубок у народнай мастацкай культуры XVIII – XIX стст.*

Тэрміналагічнае паняцце слова «лубок». Гісторыя развіцця лубачнай карцінкі. Функцыянальнае прызначэнне лубка, спосабы яго вырабу. Сутнасць лубачнай карцінкі як прадмета творчасці: вобразна-пластычныя, зместавыя і эстэтычныя асаблівасці. Віды лубка: «сур'ёзны», «гульнявы», «асветны», «сатырычны». Вытворчасць лубачных карцінак ва ўмовах працы тыпаграфій. Зборы лубкоў Іванам Луцкевічам у беларускім музеі ў Літве з пачатку XX ст.

Асноўныя характарыстыкі лубачных карцінак. Мастацкая сістэма і эстэтыка інтэрпрэтацыі традыцыйнага і прафесійнага мастацтва. Літаратурная і вербальная мова тэкстаў. Сінкрэтычная асаблівасць лубка як прадмета выяўленчага мастацтва, літаратуры, пісьма і друку. Сучасныя праявы лубачнага стылю ў прафесійным мастацтве.

*Народныя асновы мастацкага аздаблення рэкламнай шыльды і батлейкі*

Характарыстыка рэкламнай шыльды і яе развіццё ў перыяд XIX–XX стст. Віды рэкламнай шыльды, зместавая і мастацка-вобразная накіраванасць. Майстэрні па вырабе шыльдаў, мастакі-рамеснікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Узнікненне батлейкі ў Беларусі. Прызначэнне батлейкі і яе разнавіднасці. Мастацкае аздабленне, рэпертуар лялечнага тэатра.

*Мастацкі роспіс на шкле і тканіне*

Сувязь мастацтва роспісу на шкле са шклаpобствам у Беларусі. Іканапіс на шкле, карцінкі на казачныя, гістарычныя, бытавыя сюжэты. Тэхналогія роспісу на шкле, развіццё промыслу. Сувязь народнага роспісу на шкле з сучасным прафесійным мастацтвам.

Маляваныя дываны і іх развіццё ў 1940–50-я гг. Творчасць Я. Драздовіча, Алены Кіш, Ф. Сухавілы, Г. Курыловіч. Кампазіцыя і змест маляваных дываноў. Адраджэнне традыцыі маляваных дываноў у навучальным працэсе вузаў, сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, цэнтраў эстэтычнага выхавання дзяцей і моладзі на сучасным этапе.

### *Тэма 2. Асаблівасці развіцця традыцыйнага народнага і аматарскага выяўленчага мастацтва ў перыяд 1920–40-х гг.*

*Мастацка-адукацыйны працэс і культурная палітыка Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст.*

Культурная палітыка 20-х гг. XX ст. Развіццё самадзейнага выяўленчага мастацтва. План манументальнай прапаганды і ўдзел у яго рэалізацыі народных майстроў, рамеснікаў, мастакоў-аматараў. Мастацкае аздабленне агітцягнікоў, агітпавозак і агітпараходаў. Стварэнне мастацкіх школ, студый выяўленчага мастацтва. Віцебская мастацкая школа, яе значэнне ў развіцці мастацкай культуры. Трансфармацыйныя працэсы ў мастацкай школе, стварэнне мастацкага тэхнікума. Дзейнасць мастацкай студыі імя М. А. Врубеля ў Гомелі.

Мастацкія выстаўкі канца XIX – пачатку XX ст. Дзейнасць музеяў і Інстытута беларускай культуры (Інбелькульт) у галіне культуры, адукацыі і выхавання.

*Выяўленчая творчасць мастакоў-партызан на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны*

Партызанскія рукапісныя часопісы і іх мастацкае аздабленне. Мастакі-афарміцелі і іх роля ў выпуску рукапіснага друку. Жанравая і ідэйна-зместавая асаблівасць выяўленчага мастацтва ва ўмовах партызанскай барацьбы з фашысцкімі захопнікамі.

Тэматычныя замалёўкі, пейзаж, партрэт, плакат, сатырычная графіка. Партызанская творчасць у кантэксце ўсенароднай барацьбы савецкага народа за незалежнасць нашай Радзімы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 3. Народная выяўленчая творчасць другой паловы XX – пачатку XXI ст. Структура кіруючых арганізацый і кадравае забеспячэнне сферы народнай творчасці*

*Выяўленчая самадзейнасць Беларусі ў пасляваенны перыяд і дзейнасць арганізацыйна-метадычных інстытутаў па яе развіцці*

Рэспубліканскі дом народнай творчасці і Рэспубліканскі дом самадзейнай творчасці, іх структура і функцыі. Выставачная дзейнасць у першыя пасляваенныя гады. Стварэнне студый і гурткоў выяўленчага мастацтва. Работа вучэбна-творчых семінараў і канферэнцый з кіраўнікамі калектываў мастацкай творчасці. Крытэрыі ацэнак твораў самадзейнага выяўленчага мастацтва ў 1950–60-я гг. Стварэнне клубаў самадзейнай творчасці. Фестывалі народнай творчасці. Народная мастацкая творчасць як масавы сацыякультурны рух.

*Стан і шляхі развіцця народнага выяўленчага мастацтва Беларусі ў постсавецкі перыяд*

Рэарганізацыя структуры кіравання народнай творчасцю ў пачатку 1990-х гг. Стварэнне дамоў рамёстваў, дамоў творчасці і дамоў фальклору. Арганізацыйная, выхаваўчая і творчая дзейнасць дамоў рамёстваў. Саюз майстроў народнай творчасці, структура і функцыі. Выставачная дзейнасць, правядзенне свят народнай творчасці, фестываляў і ярмарак. Работа абласных метадычных цэнтраў народнай творчасці, раённых цэнтраў культуры.

### *Тэма 4. Выяўленчы прымітыў і формы яго праяўлення ў народным мастацтве*

*Мастацкая прырода і сюжэтна-тэматычны комплекс выяўленчага прымітыву*

Феномен выяўленчага прымітыву і вобразна-зместавая яго сутнасць. Прыродатворчая энергетыка наіўнага мастацтва. Выяўленчы прымітыў і традыцыйнае народнае мастацтва. Вобразна-семантычныя матывы і знакава-сімвалічная прырода мастацтва прымітыву. Сувязь прымітыву з фальклорам. Творчасць мастакоў-прымітывістаў Анры Русо, Івана Генераліча, Пірасманашвілі, Івана Селіванава, Паўла Лявонава. Партрэт і тэматычная карціна наіўных мастакоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Трансфармацыя мастацтва прымітыву ў творчасці прафесійных мастакоў Міхаіла Ларыёнава, Наталлі Ганчаровай, Марка Шагала.

Класіфікацыя выўленчага прымітыву. Міжнародныя трыенале наіўнага мастацтва, канферэнцыі і сімпозіумы. Выданне сусветнай энцыклапедыі, каталогаў і зборнікаў па наіўным мастацтве.

*Вобразы прадметнага свету ў прасторы карціны наіўнага жывапісу і пластыцы драўлянай скульптуры*

Жанры і тэматыка наіўнага жывапісу. Прыёмы і выяўленча-выразныя сродкі мастакоў-жывапісцаў. Творчасць Ліліі Трохалёвай. Выяўленчы почырк і тэматыка жывапісных карцін мастачкі.

Мастацтва жывапісца з Віцебскай вобласці Васіля Жарнасека, асаблівасці яго творчай манеры, удзел у мастацкіх выстаўках, сучасныя зборы творчай спадчыны ўнікальнага народнага майстра.

Характарыстыка і мастацтвазнаўчы аналіз жывапісу Міхася Засінца, Маргарыты Сайфугаліевай, Марыі Ларынай, Фёдара Максімава.

Уклад у айчынную мастацкую культуру дасягненняў прадстаўнікоў народнай скульптуры – А. Пупко, С.Шаўрова, М. Ерафеева, А. Асіпковай, І. Супрунчука.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Бакушинский, А. В.* Игрушка как разновидность примитивной пластики / А. В. Бакушинский // Исследования и статьи : избр. искусствовед. тр. / А. В. Бакушинский. – М. : Б. и., 1981. – С. 309–314.

2. *Барышаў, Г. І.* Беларускі народны тэатр батлейка / Г. І. Барышаў, А. К. Саннікаў. – Мінск : Выд-ва М-ва выш., сярэд. спец. і праф. адукацыі БССР, 1962. – 163 с.

3. *Барышев, Г. И.* Художественное оформление белорусского кукольного театра батлейки / Г. И. Барышев // Белорусское искусство : сб. ст. и материалов / Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора ; ред. : П. Глебка, М. Лужанин. – Минск, 1957. – С. 63–78.

4. *Воронов, В. С.* Крестьянское бытовое искусство / В. С. Воронов. – М. : [Б. и.], 1921. – С. 13.

5. *Гісторыя* беларускага мастацтва : у 6 т. / рэдкал. : С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987–1994. – Т. 2 : Другая палова XVI – канец XVIII ст. / рэд. Я. М. Сахута. – 1988. – 384 с.

6. *Некрасова, М. А.* Народное искусство как часть культуры. Теория и практика / М. А. Некрасова. – М. : Искусство, 1983. – 344 с.

7. *Пластыка* Беларусі XVII–XVIII стагоддзяў / аўт. і склад. Н. Ф. Высоцкая. – Мінск : Беларусь, 1983. – 230 с.

8. *Ягоўдзік, У. І.* Алена Кіш : альбом / У. І. Ягоўдзік. – Мінск : Беларусь, 1990. – 15 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Дадатковая*

1. *Балдина, О.* Пространство мира и пространство картины наивного художника (к постановке проблемы) / О. Балдина // Философия наивности : сб. ст. / сост. А. С. Мигунов. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 2001. – С. 149–159.

2. *Богемская, К. Г.* Понять примитив. Самодеятельное, наивное и аутсайдерское искусство в XX веке / К. Г. Богемская. – СПб. : Алетейя, 2001. – 183 с.

3. *Канцедикас, А.* Искусство и ремесло / А. Канцедикас. – М. : Изобр. искусство, 1977. – 86 с.

4. *Лемтюгова, Ю. А.* Феномен наивного искусства / Ю. А. Лемтюгова // Феномен наивного искусства и творчества аутсайдеров в наши дни и его проблемы : материалы Междунар. науч. конф., Москва, 16–17 нояб. 2004 г. / Музей наив. искусства. – М., 2004. – С. 129–131.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**НАРОДНАЕ ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА**

*Вучэбная праграма па спецыяльнасці 1-15 02 01*
*Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці*
*1-15 02 01-07 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва*
*(рэстаўрацыя вырабаў)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2013. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,82. Ул.-выд. арк. 0,45. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ